ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕУ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 168 (1437) | ЧАЦЬВЕР, 23 ліпеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

Напярэдадні Міжнароднага чырвонага дню

Небачаны ў гісторыі сусьветны экономічны крызіс з кожным днём працягвае паглыбляцца.

Краіну „процьветания" Амэрыку крызіс ахапіў з вялікай сілай. Усяго толькі пара год таму назад соцыял-дэмократы „выводзілі законы" аб „амэрыканскай выключнасьці". Ім падпявалі правыя опортуністыя, сёньня гэтыя „законы" і „тэорыйкі" напярпелі крах.

11 мільёнаў асуджаных на голад беспрацоўных у Амэрыцы пачынаюць ня вытрымліваць рэжыму і ўсё часьцей узьнімаюць на вуліцах сьцягі комуністычнай партыі.

Армія, асуджаная на голад, армія беспрацоўных ва ўсім капіталістычным сьвеце дасягае да 40 мільёнаў.

Асабліва паражоную крызісам мы маем Нямеччыну і фашысцкую Польшчу. У Нямеччыне, сьціснутай ланцугамі Юнга, мы зараз маем банкроцтвы банкаў, трэстаў. Гэтыя банкроцтвы пагражаюча дзейнічаюць шэрагу іншых краін, бо гаспадарка Нямеччыны зьвязана з амэрыканскай, ангельскай француcскай, швэйцарскай, галандзкай і г. д.

Клясавая барацьба рэзка абвастраецца, расьце ўплыў комуністычнае партыі. Сярод асуджаных на голад мільёнаў мас усё часьцей пачынае гучаць лёзунг рэволюцыі, узмацняецца браджэньне ў шэрагах соцыял-дэмократыі, павялічваецца адсеў рабочых з соцыял-дэмократычных партый. Нямецкі комсамол упяршыню ў гісторыі па сваёй колькасьці зараз стаў большым, чым соцыял-дэмократычныя організацыі моладзі Нямеччыны.

Буржуазія ў адказ на рост рэволюцыйнага руху ўзмацняе рэпрэсіі, тэрор. За апошнія часы паводле надзвычайнага дэкрэту мы маем цэлую кампанію, узьнятую фашызмам і соцыял-фашызмам супроць компартыі і яе друку. Адна за другой забараняюцца комуністычныя газэты. Буржуазны друк адкрыта патрабуе забароны компартыі.

Рэзкае абвастрэньне экономічнага крызісу мы маем і ў фашысцкай Польшчы. Абурэньне шырокіх працоўных мас супроць існуючага ладу даходзіць да крайнасьці. Аб чым іншым, як не аб гэтым сьведчаць бурныя выступленьні беспрацоўных, разгромы магістратаў, крывапралітныя сутычкі з паліцыяй. Меўшыя месца забастоўкі: тэкстыльшчыкаў у Бельску, гарнякоў Дамброва, варшаўскіх трамвайшчыкаў і інш. Рэволюцыйны ўздым мас абрабаванага сялянства на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне і ў карэннай Польшчы—сьцьвярджаюць што рэволюцыйны рух падымаецца угару, нарастаюць прадпасылкі рэволюцыйнага крызісу.

Пашыраецца прарыў імпэрыялістычнага фронту там, у Кітаі, дзе перакрыжоўваюцца супярэчнасьці сусьветнага імпэрыялізму.

Ня гледзячы на ўзмоцненыя спробы Чан-Кай-Шы пры падтрыманьні імпэрыялістых раздавіць Чырвоную армію, ліквідаваць савецкія раёны, Чырвоная армія пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі вытрымлівае геройчную барацьбу. Рэволюцыйны рух ня толькі ахоплівае провінцыі поўдня, а пачынае пашырацца ў провінцыях поўначы. Рэволюцыйны крызіс у Кітаі разьвіваецца.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, організуюцца масы рабочых і сялянства ў Гішпаніі для барацьбы з фэодальна-царкоўнай рэакцыяй. Рэволюцыйны рух у Гішпаніі знаходзіцца на ўздыме. Аб гэтым гавораць факты, якія мелі месца ў час выбараў гішпанскай учрэдзілкі.

Мы стаім перад новымі баямі ў Індыі. Працоўныя масы Індыі ўзмацняюць барацьбу супроць ангельскага імпэрыялізму і сваёй буржуазіі. Разам з тым, усё больш выяўляецца здрадніцкая, контррэволюцыйная роля рэформістых і гандзізма, які выступае ў ролі адкрытай агентуры ангельскіх імпэрыялістых.

Характарыстыка становішча ў пералічаных намі краінах гаворыць аб паглыбленьні супярэчнасьцяй унутры імпэрыялістычнага лягеру, аб абвастрэньні і разгортваньні клясавай барацьбы, аб перарастаньні экономічнага крызісу ў крызіс політычны (Кітай), аб нарастаньні прадпасылак рэволюцыйнага крызісу (Нямеччына, Польшча).

Буржуазія шукае выхаду з крызісу ў новым узмацненьні наступленьня на рабочую клясу і сялянскія масы, ва ўзмацненьні эксплёатацыі і нажыму на колёніі, ва ўзмацненьні тэрору і ў падрыхтоўцы вайны.

Пролетарыят шукае выхаду з крызіса ў разгортваньні рэволюцыйнай барацьбы за соцыяльнае і нацыянальнае вызваленьне пад лёзунгамі комуністычнае партыі. Савецкі Саюз з кожным днём на меры соцыялістычных перамог становіцца ўсё большым і большым прыкладам для шырокіх рабочых і сялянскіх мас замежных краін.

Падрыхтоўка інтэрвэнцыі супроць СССР набывае ўсё больш выразны характар. Польшча ў гэтым, пад кіраўніцтвам Францыі і за грошы францускага імпэрыялізму грае, як мы ўжо ня раз адзначалі, перадавую ролю;—аб гэтым мы прыводзілі ня мала фактаў. Кампанія ў фашысцкім друку супроць СССР, новы факт анты-савецкага выступленьня рэдактара газэты „Слова" Мацкевіча з заклікам да тэрорыстычных актаў супроць выдатных дзеячоў Савецкай рэспублікі, нарэшце, польска-румынскія перагаворы, якія зараз вядуцца ў Варшаве,—усё гэта новыя і новыя зьвеньні ў агульным ланцугу падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР.

Соцыял-дэмократычныя партыі II Інтэрнацыяналу з большай інтэнсыўнасьцю працягваюць выкананьне сваёй ролі лёкаяў буржуазіі, як у падаўленьні рэволюцыйнага руху ў буржуазных краінах, так і ў падрыхтоўцы анты-савецкай вайны. Гэтымі днямі ў Вене адчыняецца зьезд соцыял-дэмократычных партый II Інтэрнацыяналу.

І гэты зьезд значную долю сваёй работы аддасьць выкананьню анты-савецкіх намераў буржуазіі.

Усё гэта робіць надзвычайна адказную абстаноўку, у якой будзе праводзіцца Міжнародны чырвоны дзень у гэтым годзе. Мы напярэдадні буйных грандыёзных выступленьняў пролетарыяту супроць існуючага рэжыму, за сваё вызваленьне ад рабаўніцтва эксплёататараў, супроць прыхвасьняў буржуазіі—соцыял-дэмократыі, супроць падрыхтоўкі анты-савецкай вайны, за абарону СССР—ударнай брыгады сусьветнага пролетарыяту.

Буржуазія адчувае гэта. Таму зараз, напярэдадні 1-га жніўня, яна ўзмацняе тэрор, забараняе комуністычны друк, разгортвае арышты рабочых і комуністых і ў ліхарадцы крызісу рыхтуе новыя расправы з рабочымі на вуліцах гарадоў Нямеччыны, Польшчы і шэрагу іншых краін.

Пролетарыят пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі ў гэты дзень моцнымі калёнамі будзе дэманстраваць свае сілы. Пролетарыят ведае, што гісторычныя тэрміны пагібелі капіталізму ў яго руках.

Комсамол Францыі рыхтуецца да 1-га жніўня

„Авангард" апублікаваў адозву

ПАРЫЖ. Орган комсамолу Францыі „Авангард" апублікаваў адозву, у якой заклікае рабочую моладзь выступіць 1-га жніўня на заводах і фабрыках супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць наступленьня капіталістых на зарплату, супроць прасьледваньня рэволюцыйных рабочых і салдат, супроць голаду, які рыхтуе буржуазія рабочай моладзі. Адозва заклікае рабочую моладзь выступіць у абарону Савецкага Саюзу, за аслабаненьне зьняволеных рабочых і солдат, у абарону органа саюзу моладзі „Авангард".

Адозва прапануе організаваць 1-га жніўня забастоўкі, мітынгі ля брам прадпрыемстваў і вулічныя дэмонстрацыі, якія павінны зьявіцца падрыхтоўкай да XVII-га міжнароднага юнацкага дня. Да гэтага дня прысьвечана паездка ў СССР дэлегацыі рабочай моладзі.

Напад на памяшканьне ЦК нямецкай компартыі

БЭРЛІН, 21. Сёньня пасьля абеду паліцыя заняла будынак ЦК нямецкай компартыі. Вытвараны даклады вобыск. Двое арыштаваных. Паліцыя конфіскавала некалькі сот брошур і газэт.

Расправа з комуністычным друкам

БЭРЛІН. Бэрлінскі паліцэй-прэзыдэнт, соцыял-дэмократ Гржэзінскі ў гутарцы з рэдактарам „Бэрлінэр Тагеблат" заявіў па поваду надзвычайнага дэкрэту супроць опозыцыйнага друку, што „у будучым больш непатрэбны доказы злачынства для таго, каб забараніць газэту. У будучым забарона можа быць вынесена на падставе „ацэнкі".

Забарона комуністычнага друку працягваецца. Пасьля пазаўчарашняй забароны 6 комуністычных газэт, сёньня зноў забаронены яшчэ газэты. Забарона „Арбэйтэр Цэйтунг" у Франкфурце на Майне матывуецца апублікаваньнем сьпіску штурму ашчадкас. Падставай для конфіскацыі апошняга нумару газэты паслужылі пацьвярджэньні што „нічто больш ня верыць у пакойваючым казкам".

МЫ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ КОЖНЫ ВІНЬЦІК ВАРШТАТУ, ВЕДАЦЬ ТЭХНІКУ ПЕРАМОГ, бо комсамолец, не ўладаўшы тэхнікай, ДРЭННЫ ДЫРЭКТАР ВАРШТАТУ

Склаўшы плян канкрэтных дзеяньняў, Віцебскі комсамол не ўзяўся за яго ажыцьцяўленьне

Ня гледзячы на рад добрых пастаноў па ўладаньню тэхнікай, мы да гэтага часу па раду комсамольскіх організацый назіраем павярхоўныя адносіны да гэтага пытаньня.

Матар'ялы, зьмяшчаемыя сёньня, з усёй яскравасьцю сьведчаць аб тым, што на буйнейшых прадпрыемствах БССР пытаньне ўладаньня тэхнікай засталося на паперы. Спасылаючыся на об'ектыўныя прычыны (адсутнасьць памяшканьня, прылад, кіраўнікоў) некаторыя комсамольскія організацыі ня выконваюць узятых на сябе абавязкаў.

Такое становішча далей нецярпіма. Навызшаныя задачы трэцяга рашаючага патрабуюць хутчэйшага ўладаньня тэхнікай кожным рабочым.

Неабходна шматлікія абяцаньні і пастановы конкрэтна ператварыць у жыцьцё. Вопыт мэбелявай фабрыкі (Віцебск) павінны пераняць усе фабрыкі і заводы.

Абавязацельствы ня выконваюцца

У свой час пленум Віцебскага гаркому ЛКСМБ высунуў шэраг практычных мерапрыемстваў для кожнай комсамольскай ячэйкі па разгортваньню тэхнічнай вучобы комсамольцаў і рабочай моладзі.

Але-ж комсамольскімі ячэйкамі гэтыя мерапрыемствы ажыцьцяўляюцца вельмі марудным тэмпамі. Тэхнічнай вучобай па Віцебску зараз ахоплена ня больш 20 проц. комсамольцаў і рабочай моладзі.

На фабрыцы „Сьцяг індустрыялізацыі" было іменавальне ўвесьці 8-ю гадзіну для тэхнічнай вучобы, але-ж на працягу амаль трох месяцаў гэтая справа „вывучаецца".

„Няма памяшканьня, няма абсталяваньня, няма дзён" гавораць кіраўнікі, а пакульшто з трох тысяч рабочых тэхнічнай вучобай ахоплена толькі 80 чалавек.

„Чырвоны мэталісты". Маюцца агульна-фабрычныя курсы, якія займаюцца рэгулярна, але-ж наведваньне з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі надзвычайна дрэннае (4—5 асоб).

Панчошная фабрыка. З організаваных 8-мі гурткоў працуе 3. Наведвае іх ня больш 20 проц. комсамольцаў. Бюро колектыву сталага вучоту ў ячэйках не вядзе.

Фабрыка „Дзьвіна". Былі праведзены 3 школы аднадзёнкі, якія далі значныя вынікі, але-ж апошнія не замацаваны, бо тэхнічныя гурткі ў цэхох не працуюць па віне кіраўніка. Вызначаныя дні тэхнічнай вучобы ў большасьці сваёй зрываюцца па віне грамадзкіх організацый.

Лепш пастаўлена справа ўладаньня тэхнікай на інструмэнтальна-мэблявай фабрыцы. Заняткі праводзяцца рэгулярна кожную пяцідзёнку, маецца тры сталых кіраўнікі, рабочыя, якія займаюцца тэхнічнай вучобай, забясьпечаны абсталяваньнем і тэхнічнымі прыладамі. У програму заняткаў уваходзіць тэхнолёгія дрэва, чарчэньня, матэматыка, тэхнолёгія варштату, і рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

Становішча з тэхвучобай у горадзе пагражаючае. Комсамольскім ячэйкам патрэбна зараз-жа замацаваць работу маючыхся гурткоў і ўзяцца за практычнае ажыцьцяўленьне рашэньняў пленуму гаркому ЛКСМБ па гэтаму пытаньню.

Комсамольцы павінны быць у першых шэрагах па выкананьню рашэньняў ЦК КП(б)Б аб увядзеньні 8-й гадзіны тэхвучобы на прадпрыемствах, працуючых 7 гадзін.

Смолікава.

Пашумелі і застылі

Комсамольская ячэйка беладрэўнага цэху Бабруйскага комбінату ў свой час падняла вялікую кампанію сярод комсамольцаў і рабочае моладзі за ўладаньне тэхнікай. Тады-ж былі організаваны розныя курсы па падвышэньню кваліфікацыі і праведзены шэраг іншых мерапрыемстваў. Але ўсё гэта прайшло кампанейскі і ўжо трэці месяц курсы не працуюць, пытаньне-ж аўладаньня тэхнікай не стала першачарговым у рабоце ячэйкі.

Між тым, брак дэталей у цэху з усёй настойлівасьцю гаворыць за неабходнасьць хутчэйшага вывучэньня тэхнікі.

Маюцца такія выпадкі, калі з-за таго, што рабочы ня выходзіць на працу, варштат застанаўліваецца, бо ніхто ня ведае тэхнікі гэтага варштату. Прастой кожнага варштату надзвычайна цяжка адбіваецца на працы ўсяго цэху.

Комсамольская ячэйка, рацыяналізатарскае бюро, спэцыялістыя і майстры цэху мусіць лічаць, што аўладаньня тэхнікай іх не датычыцца.

Н. Габрынец

Тэхніцы месца няма

Пытаньне вывучэньня тэхнікі на Магілеўскай швэйнай фабрыцы імя Валадарскага не знайшло месца сярод спраў комсамольскай ячэйкі.

У свой час было вынесена шмат пастаноў па гэтаму пытаньню, але-ж усё гэта засталося на паперы.

А ў цэхах кожную хвіліну адчуваецца патрэба ў вывучэньні тэхнікі. Ламаецца іголка лопнуў рэмень—чакаюць мэханіка, а ўвесь агрэгат сядзіць бяз працы.

Такіх зьявішч можна пазбавіцца толькі шляхам аўладаньня тэхнікай не на паперы, не ў рэзолюцыях, а па-сапраўднаму ў гуртках і школах.

Мы патрабуем ад кіруючых организацый фабрыкі зараз-жа ўзяцца за рэалізацыю сваіх пастаноў па гэтаму пытаньню.

Брыгада юнкораў: Гарэлаў, Бахман, Халіпскі, Тылін Фонкац

Рэалізуем пазыку тэхнікі

Узмацнім працу па аўладаньні тэхнікай

На заводзе „Зьвязда" (ст. Капцэвічы) шырока разгарнулася праца па рэалізацыі пазыкі тэхнікі. Рабочая моладзь зразумела велізарнейшае значэньне ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці, асабліва на гэтым заводзе, дзе ў варштата часта працуюць мала кваліфікаваныя рабочыя і адчуваюць вострую патрэбу ў тэхнічнай вучобе.

Як недахоп трэба адзначыць, што комсамольская ячэйка правяла недастатковую працу па рэалізацыі гэтых пазыкі сярод некваліфікаванай часткі старэйшых рабочых.

П. Прыпяцкі

У бой за мільён тон сілосу

КОЛГАС „АГАНЕК“ АСЬВЕТЛІЎ ШЛЯХ ПЕРАМОГ

Комсамольскіх калён яшчэ ня відаць на фронце сілосу

УБРАЦЬ З ДАРОГІ ОПОРТУНІСТЫХ,—„ГЕРОЯЎ“ ПРАРЫВАЎ

Друкуемы сёньня матар'ял яшчэ раз падцьвярджае што наасобныя комсамольскія організацыі не ўразумелі палітычнай важнасьці выкананьня пляну сілосаваньня, не ўразумелі сваю адказьнейшую ролю як шэфа сілосу.

Сілосны фронт яшчэ да гэтуль аголен. Комсамольскіх колён на ім яшчэ ня бачна. І таму опортуністыя тыпу Балбуцкіх і Радчукаў яго яшчэ больш дэзорганізуюць.

Той факт, што колгас „Аганёк“ Рагачоўскага раёну выканаў 43 проц. гадавога пляну ў чэрвені і ліпені месяцы, і будзе ўвосень сілосаваць засеяных 3, 5 га сілосных культур, даказвае рэальнасьць выкананьня пляну сілосаваньня, паказвае як трэба змагацца за яго выкананьне.


Самае галоўнае: узяцца як сьлед, па комсамольску, па-баявому за ліквідацыю прарываў, за выкананьне плянаў сілосаваньня. Ад таго, наколькі асобныя раённыя організацыі і ячэйкі з гэтым справяцца будзем судзіць здольнасьць кіраўніцтва гэтых комсамольскіх організацый выконваць заданьне партыі ўскладзенае на комсамол.

Комсамольцы! Вы прозяваеце сілос

Церахаўка. У Вуцеўскім сельсавеце дагэтуль нічога ня робіцца па сілосаваньню. Ямы і траншэі ня будуюцца. Чэрвень месяц „празявалі“ і не засілосавалі ніводнага кілё зялёнай масы.

Колектыў комсамольскіх ячэек гэта ня трывожыць. Калі-ж, нарэшце, комсамольцы возьмуцца за выкананьне пляну сілосаваньня?

Кірушчэнка С.



Загатоўка сілоснай масы. Колгас „Новае Лядцо“ Пухавіцкага раёну

Раўненьне на колгас „Аганёк“

Плян сілосаваньня выканан на 43 проц.

Колгас „Аганёк“ Пабалоўскага сельсавету, Рагачоўскага раёну, па-ударнаму праводзіць работу па сілосаваньні кармоў Ужо засілосавана 60 тон, або 43 проц. пляну. Сілосных культур для асеньняга сілосаваньня засеяна 3,5 га.

Комсамольская брыгада па сілосаваньні зьяўляецца першай ў колгасе па правядзеньні гэтай работы.

Рыг. М.

Гора-сэкратаром ня месца ў кіраўніцтве

Забясьпечыць выкананьне плянаў сілосаваньня

У радзе комсамольскіх ячэек Мазырскага раёну палітычная недаацэнка сілосаваньня прывяла да поўнага зрыву кампаніі.

У Дудзіцкай яч. дагэтуль не дадумаліся ачысьціць сілосную яму, дзе летась сапсаваўся сілос. Яма і зараз загружана гнільлю. Сэкратар яч. тав. Піпчук, заяўляе: „Сілос нас не датычыць, з нас хапае іншай работы“.

Сэкратар яч. Антонаўка разважае так: „У нас хапае сена. Вазіцца з сілосам—дарэмная згуба часу“.

Райком не дае рашучага адпору гэтым права-опортуністычным разважаньням і практыцы. Мы патрабуем зараз-жа зьняцьця з кіраўніцтва сэкратароў—гэтых ячэек і забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў сілосаваньня.

Вотчык Ц С.

На Тураўшчыне яшчэ разважаюць

Па опортуністых тыпу Балбуцкіх і Радчукаў—руйнуючы удар

У Тураўскім раёне да закладкі сілоснай масы прыступіў толькі адзін местачковы колгас „Новае жыцьцё“. Астатнія колгасы нічога конкрэтнага не зрабілі, каб выканаць плян сілосаваньня.

Рад колгасаў адмаўляецца ад закладкі сілосных ям. Старшыня Запясоцкага колгасу Балбуцкі заявіў, „Хопіць у нас і сена, ніякіх сілосаў закладваць ня буду“.

Райколгассаюз не забясьпечыў належным кіраўніцтвам правядзеньне сілоснай кампаніі: Курсы па сілосаваньні працавалі дрэнна. Інструктар райколгассаюзу, які спэцыяльна займаецца пытаньнем сілосу, т. Радчук нават ня ведаў аб існаваньні гэтых курсаў. Ён-жа на пытаньне якое становішча з правядзеньнем работы па сілосаваньню, адказаў: „Цяпер усе занятыя. няма часу займацца сілосам“.

Такія опортуністычныя настроі, якія ператвараюцца у практыку не сустракаюць належнага бою.

Комсамольская організацыя Тураўшчыны яшчэ не зразумела, што комсамол зьяўляецца шэфам сілосу і гэтаму пытаньню надае вельмі малае значэньне,

Трэба неадкладна адвесьці пагрозу зрыву пляну сілосаваньня. Комсамол павінен апраўдаць імя шэфа.

Пост „ЧЗ“. Міхась.

Ударыць па лежабоках

Сьмілавічы. Комсамольская ячэйкі яшчэ дагэтуль не разварушыліся і стаяць у баку ад правядзеньня сіласаваньня. Ячэйка пры саўгасе „Серп“, колгасе „Чырвоны профінтэрн“ нават не абгаварылі яшчэ гэтага пытаньня на сваіх сходах. Ня лепш і ў другіх ячэйках.

Пляны сіласаваньня зрываюцца. Райком комсамолу павінен зараз-жа праверыць удзел комсамольскай організацыі ў сіласаваньні і забясьпечыць сваім конкрэтным кіраўніцтвам выкананьне плянаў.

Калючы

Колгасы ня ведаюць

Глуск. У колгасах Ляскавіцкага сельсавету выкананьне Чэрвеньскага пляну сілосаваньня сарвана.

Рад комсамольскіх ячэек ганебна зрывае падрыхтоўку да 40 проц. пляну сілосаваньня і ў ліпені месяцы.

У колгасах, організаваных у гэтую вясну, нават яшчэ не праведзена растлумачальная работа аб сілосаваньні.

Комсамольскія ячэйкі павінны па-ўдарнаму разгарнуць работу, каб выканаць плян закладкі сілосу.

Пятрусь Дзехцяраў.

Опортуністыя засталіся глухімі да сыгналаў

У Сакалішчынскім сельсавеце (Расонскі раён) выкананьне пляну па сілосаваньні пад ударам. З 12 колгасаў ніводны не пачаў будаўніцтва сілосных установак. Рад колгасаў („Чырвоная Сакалішча“) не паслалі колгасьнікаў на курсы. Старшыня колгасу заявіў: „мы без курсантаў усё зробім“, але аднак, нічога не робіцца.

„Чырвоная Зьмена“ ні раз сыгналізавала аб гэтых прарывах, але опортуністыя не рэагуюць на гэта;

Я. Шпакоўскі.

Інформацыйнае паведамленьне

16-20 ліпеня адбыўся 3-ці, кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ, які разгледзіў наступныя пытаньні:

1. Аб выкананьні рашэньняў зьездаў X ЛКСМБ і IX-УсеЛКСМ аб ператварэньні комсамолу ў шматмільённую організацыю.

2. Аб выкананьні рашэньняў зьездаў па ўдзелу ЛКСМБ у нацкультбудаўніцтве.

3. Даклад Белторпаб'яднаньня і праверка выкананьня ўдзелу ЛКСМБ у вырашэньні тарфяной проблемы.

4. Вынікі вясеньняга севу, аб уборачнай і асеньняй сяўбовай кампаніі.

Пленум выключыў з складу сябраў ЦК ЛКСМБ Дурасава і вывеў т. т. Райхельсона і Гасьперскага.

У сувязі з адклікаНьнем ЦК КП(б)Б тав. Гайдукевіча на партработу, пленум аслабаніў яго ад абавязкаў старшыні ЦБ ЮП, сябра бюро і сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ

Пленум аслабаніў ад абавязкаў оргаддзелу і сябра сэкратарыяту ЦК тав. Пацукова, па яго асабістай просьбе, у сувязі з уходам на працяжнае лячэньне.

Пленум аслабаніў т Ільлічова ад абавязкаў сябра бюро ЦК, а тав. Беранзона аб абавязкаў кандыдатаў сябры бюро ЦК, у сувязі з уходам іх з комсамольскай на агульную работу.

Пленум зацьвердзіў загадчыкам оргаддзелу ЦК тав. Казлова і ўвёў яго ў сябры сэкратарыяту ЦК.

Пленум перавёў т. Рапэвіча з кандыдатаў у сябры пленуму ЦК, абраў яго сябрам бюро і сэкратарыяту ЦК і зацьвердзіў старшынёй ЦБ ЮП.

Пленум увёў у сябры пленуму ЦК і абраў сябрам бюро ЦК т. Ждана (інструктар па комсамольскай рабоце БВА).

Пленум перавёў з кандыдатаў у члены бюро ЦК т. Гузікава і абраў кандыдатамі ў сябры бюро ЦК т. т. Камісарчыка і Сапега, а з кандыдатаў у сябры пленуму пераведзены т. т. Аксянцова, Гейдэ, Кузьняцоў, Шаўцоў і Рутэнбэрг.

ЦК ЛКСМБ.

Надыходзяць рашаючыя дні ўборкі

УСЕ РЭЗЭРВЫ РАБОЧАЙ СІЛЫ—НА КОЛГАСНУЮ СЕНАЖАЦЬ

КОЖНЫ КОЛГАСЬНІК ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ ПРЫНЦЫП РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ПРЫБЫТКАЎ КОЛГАСУ

Да кантрольнага тэрміну 20 ліпеня пляны сенаўборачнай ня выкананы. Зацяжка ўборкі сенажаці—пагроза сваечасовай уборцы ўраджаю.

Як ня трэба рыхтавацца і праводзіць сенаўборку паказвае Чэрвеньскі раён і колгас імя Домбаля. Адсутнасьць сапраўднай зьдзельшчыны, правільнага ўліку, масавай работы сярод колгасьнікаў колгасу імя Домбаля давяло да ўпаду працоўнай дысцыпліны да прарываў сена борачнай кампаніі.

Да 1 жніўня кожны колгасьнік павінен ведаць пастанову Наркомзему і Колгасцэнтру аб парадку разьмеркаваньня прыбыткаў. Кожны колгасьнік павінен ведаць, што ў залежнасьці ад таго колькі і як ён будзе працаваць, ён столькі і атрымае з прыбытку і ўраджаю свайго колгасу.

Праводзячы шырокую популярызацыю гэтай пастановы, трэба мобілізаваць усе маючыяся рэзэрвы рабочай сілы колгасу, у асаблівасьці жанчын на працу па ўборцы.

У бліжэйшыя дні ўборка сенажаці павінна быць скончана.

Ліквідаваць прарывы на-хаду!

Вывесьці колгас імя Домбаля ў перадавыя

Лозінскі нацыянальны польскі сельсавет (Барысаўскага раён) сельсавет суцэльнай колектывізацыі. Асноўны буйны колгас імя Домбаля яднае 200 гаспадарак.

Толькі 50 проц. усёй рабочай сілы выходзіць на работу. Працоўны мінімум дзён для выхаду на работу да колгасьнікаў не даведзены. Цягавая сіла поўнасьцю не выкарыстоўваецца. Коні па 3-4 дні гуляюць.

Зьдзельшчына праводзіцца фармальна. Няма дакладнага ўліку працадзён. Колгасьнікі ня ведаюць, колькі яны выпрацавалі за час сенаўборкі. Пастанова Наркомзему і Колгасцэнтру аб парадку разьмеркаваньня прыбыткаў яшчэ да гэтуль не растлумачана сярод колгасьнікаў. Колгасьнікі яшчэ ня ведаюць, што яны атрымаюць ураджай і прыбыткаў па колькасьці і якасьці працы.

Асабліва дрэнна пастаўлена масавая работа сярод жанчын. Ёсьць у колгасе ясьлі, але яны агідна працуюць. Жанкі ня хочуць насіць сваіх дзяцей у ясьлі і таму ня выходзяць на працу.

Комсамольская ячэйка бачыць усе гэтыя прарывы і ніякіх мер ня прымае, каб іх ліквідаваць.

Трэба зараз-жа шырока распрацаваць і давесьці да кожнага колгасьніка пастанову Наркомзему і Колгасцэнтру аб парадку разьмеркаваньня прыбыткаў па колькасьці працы. Трэба, нарэшце, укараніць у колгасе зьдзельшчыну і ўлік.

Барысаўскі райком комсамолу павінен дапамагчы комсамольскай ячэйцы наладзіць работу, каб з посьпехам выканаць уборачную.

П. Крывіца



Штурмуюць прарывы сенаўборачнай

Галавацяпы адпачываюць...

Тварцы самацёку, блытаных плянаў і адпачынкаў дадуць адказ перад Р. С. І.

Чэрвеньскія раённыя організацыі па-баявому не падрыхтаваліся да правядзеньня ўборачнай кампаніі.

З 25-га чэрвеня раён павінен быў прыступіць да ўборкі сена. Але шырокія масы колгасьнікаў ня мобілізаваны на правядзеньне гэтых кампаній. Сенаўборка ідзе самацёкам.

Рад колгасаў (Дзяржынскага, Грабеніцкага с-с, „Перадавік“, Калодзінскага с-с) не організавалі брыгад па ўборцы сенажаці.

Райза зусім ня кіруе сенаўборачнай кампаніяй. Усе працаўнікі пашлі ў адпачынак. Аграном Савіч, які не атрымаў адпачынку, бязьдзейнічае.

Пляны сенаўборкі спушчаны ў сельсаветы, але блытаныя, незразумелыя. Сельсавецкія работнікі не здольны іх разабраць. У выніку ў наасобных сельсаветах (Хутарскі, Кліпацкі, Вавілаўскі) яшчэ да гэтага часу не складзены пляны сенаўборкі. Такое самае становішча маецца і ў саўгасе „Раванічы“ і „Маладая Гвардыя“.

Райколгассаюз і Райза ня вядуць вучоту ходу сенаўборкі. 34 колгасы з маючыхся 70 далі няпоўныя зьвесткі. Плян выкананы ня больш як на 35 проц.

Р.К.К—Р.С.І павінна палажыць канец гэтаму опортуністычнаму самацёку ў сенаўборачнай.

Міхась Ракіта.

Па-ўдарнаму

У колгасе Казбэк“ (Глускага раёну) 29-га чэрвеня пачалася масавая касьба. Усе віды работы па ўборцы сенажаці праводзяцца на аснове зьдзельшчыны і ўліку колькасьці і якасьці працы кожнага колгасьніка.

Вядзеньне ўліку працадзён кожнага колгасьніка зьявілася стымулам для ўзьняцьця вытворчасьці працы. Нормы выпрацоўкі, якія ўстаноўлены ў колгасе далёка перавыконваюцца. Колгасьнік выпрацоўвае за дзень 5/4 і нават цэлага. У час разгортваньня масавай касьбы, якая праходзіць пасьпяхова ў колгас уступілі 3 бядняцкіх гаспадаркі. Колгасу патрэбна прыбраць 75 га сенажаці. Праз два тры дні ўборка будзе скончана.

Барозка.

ШМАТМІЛЬЕННАЙ АРМІЯЙ НА ФАРПОСТЫ ПЯЦІГОДКІ

Даклад тав. Гуткіна на 3 пленуме ЦК ЛКСМБ аб росьце комсамола Беларусі

Барацьба за моладзь—барацьба за бальшавіцкія тэмпы соцбудаўніцтва

Таварышы, бюро ЦК даручыла мне далажыць пленуму ЦК як працаваў і змагаўся ленінскі комсамол Беларусі за ажыцьцяўленьне рашэньняў IX зьезду аб ператварэньні комсамолу ў шматмільённую організацыю, абмаляваць той шлях, які прайшоў наш комсамол з часу X-га ўсебеларускага і IX-га ўсесаюзнага зьездаў комсамолу.

Наша савецкая краіна, уступіўшая ў пэрыод соцыялізму і разгарнуўшая пад кіраўніцтвам ленінскай партыі пасьпяховы соцыялістычны наступ па ўсяму фронту, ў самы бліжэйшы час —у 1933 годзе. на год, а па раду важнейшых галін яшчэ раней заканчвае пяцігодку, а асноўныя-ж галіны нашай прамысловасьці, як электрычнасьць, нафтапрамысловасьць і рад фабрык і заводаў выканалі сваю пяцігодку ў 2 з пал. гады.

Вызначаныя лічбы колектывізацыі ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі перавыкананы, як па Савецкаму Саюзу, так у Савецкай Беларусі. У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі ўступаюць у строй новыя 518 фабрык і заводаў і новыя 1040 МТС рынуцца у бой за суцэльную колектывізацыю і на яе аснове ліквідацыю кулацтва ,як клясы —апошняга аплоту капіталізму ў нашай краіне.

Зараз партыя ставіць вялізарнейшую задачу—падрыхтоўкі да другой пяцігодкі, у якую будзе ўкладзена тая сума практычных дасягненьняў, аб якіх тав. Сталін гаварыў на конфэрэнцыі гаспадарнікаў, сэнс якіх заключаецца у тым, каб дагнаць і перагнаць у тэхвічна-экономічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны ў 10 год.

Другая пяцігодка, да якой зараз праводзіцца падрыхтоўка, будзе зьяўляцца адлюстраваньнем усё пашыраючагася пераможнага бальшавіцкага наступу.

Вось чаму задача рабочае клясы усіх працоўных, усіх грамадзка-палітычнах організацый нашай краіны, і перпіую чаргу ленінскага комсамолу, як самага лепшага, адданага і галоўнага памочніка нашай партыі, -- перабудаваць свае рады, пасіліць свой ўплыў на працоўныя масы.

Сэнс перабудовы заключаецца у тым каб забясьпечыць тэмпы, якія-б вырашалі задачу дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны ў 10 год, каб уцягнуць ва усе віды грамадзка-палітычнай, культурна-экономічнай дзяржаўнай дзейнасьці новыя мільёны працоўных.

IX зьезд ЛКСМ паставіў конкрэтную задачу перад усім саюзам—ператварыць ленінскі комсамол у шматмільёную організацыю.

Мы п а в і н н ы весьці бальшавіцкі наступ і змагацца за тэмпы соцбудаўніцтва ня горстачкай у 50-100 ч. па кожнаму заводу, а так, каб уцягнуць у гэтую барацьбу ўсю рабочую моладзь, у першую чаргу ўсіх дарослых рабочых.

Рабочую моладзь мы павінны згуртаваць, узброіць політычна, узброіць яе разуменьнем конкрэтных і баявых задач дня і пад кіраўніцтвам партыі павесьці яе ўсім фронтам у наступ.

Рост комсамолу, дзесяткі і сотні тысяч комсамольцаў зьяўляецца для нас не самамэтай, а сродкам для яшчэ большага падвышэньня ролі ленінскага комсамолу ў соцбудаўніцтве, для стварэньня яшчэ большай базы для росту ўплыву нашай партыі на шырачэйшыя масы працоўных і працоўнай моладзі.

Новыя дзесяткі і сотні тысяч уліўшыхся ў наш комсамол—гэта новыя дзесяткі тысяч барацьбітоў за соцыялізм, за ператварэньне Савецкай Беларусі з аграрна-індустрыяльнай у індустрыяльна-аграрную.

Перахожу да пытаньня, як ЛКСМ Беларусі ажыцьцяўляў рашэньні IX зьезду УсеЛКСМ аб шматмільённым КСМ.

З часу 10-га зьезду 3400 новых комсамольцаў

Да часу X Беларускага і IX зьезду УсеЛКСМ наш беларускі комсамол налічваў у сваіх шэрагах 96.125 чал. На 1-е красавіка 1931 г. мы мелі 104.125 чал., на першае ліпеня мы маем ужо 122.363 чал., а на 10-е ліпеня ўжо налічваем больш чым 130.000.

За квартал кастрычнік 1930 г. па студзень 1931 г.—прынята ў комсамол 7630 чал., з іх прамысловых рабочых 29,9 проц., сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў—17 проц., беднякоў —34,19 серадлякоў—13,5 проц.. За першы квартал пасьля зьездаў прынята 9451 чалавек, з іх 32 пр. рабочых, 11 пр. сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў 36,6 проц. беднякоў, 16,5 проц. серадлякоў.

За другі квартал 1931 г. прынята 17.738 чал., з іх 35,2 проц. рабочых 6,3 проц. сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў 49,7 проц. колгасьнікаў, 4 проц. беднякоў і 1,2 проц. серадлякоў.

У процантных адносінах комсамольская організацыя характарызуецца: колгасьнікаў—87,6 проц., беднякоўаднаасобнікаў—9 проц., серадлякоўаднаасобнікаў — 3,4 проц. Значыць, трэба прызнаць зусім правільным рост КСМ па соцыяльных групах. Рост пасьля нашых зьездаў зьяўляецца доказам таго, што комсамол навялічыў сваю ролю ў соцбудаўніцтве—з аднаго боку, а з другога боку—гэтыя 34.000 новых комсамольцаў, якія ўліліся ў ЛКСМБ з часу зьезду, сьведчаць аб глыбокай адданасьці працоўнай моладзі нашай ленінскай партыі.

Калі параўняць тэмпы росту з ростам ад IX да X зьезду ЛКСМБ, дык атрымоўваецца такі малюнак: за 2 з паловай гады ад IX да X зьезду ЛКСМБ наш комсамол вырас на 50.000 чал., а за 5 месяцаў пасьля зьезду на 34.000 чал.

Бязумоўна, гэтыя тэмпы росту яшчэ зьяўляюцца нездавальняючымі. Гэтыя тэмпы нельга назваць здавальняючымі таму, што калі мы будзем так расьці, дык задачу аб шматмільённым комсамоле ня выканаем і ў бліжэйшы тэрмін. Тэмпы соцбудаўніцтва патрабуюць ад нас лепш працаваць, чым мы працавалі да гатага часу. Адсюль вынік нам неабходна неадкладна разбураць усе перашкоды. якія перашкаджаюць нам у рабоце па ператварэньню ленінскага комсамолу у шматмільённую організацыю.

Раней, чым перайсьці да характарыстыкі перашкод і бар'ераў, якія не давалі магчымасьці лепш расьці. трэба праілюстраваць вопыт работы асобных організацый па ператварэньню КСМ у шматмільённую організацыю асабліва за час падрыхтоўкі да кантрольнага пленуму ЦК. Рад організацыі разгарнулі больш-менш здавальняючую работу на грунце шырокага разгортваньня масавай работы па росту КСМ, напрыклад .Менск. У комсамол Менскай організацыі за 1-шы квартал прыняла 672 чал. за другі квартал 2195 чал. За чэрвень м-ц 1527 чал, за 15 дзён ліпеня каля 2000 чал. прычым за апошнюю пяцідзёнку Менская організацыя прыняла ў свае рады 1551 чал. У Менску у асноўным акомсамолена ўжо рад прадпрыемстваў: зав. „Комунар", „Пролетары". Полымя Рэволюцыі" і рад іншых прадпрыемстваў, цэхаў, агрэгатаў, акрамя гэтых за апошні час ужо акомсамолены.

Віцебская організацыя прыняла ў комсамол за 1-ы квартал 899 чал, за другі квартал 2444 чал, за чэрвень м-ц 1415 чал. у Віцебску мы маем акомсамоленымі 8-ю стужку ф-кі „Сьцяг індустрыялізацыі" якая перавыканала свой прамфінплян датэрмінова ў зьвязку з падрыхтоўкай да кантрольнага пленуму ЦК. У Віцебску мы маем першую ў БССР акомсамоленую школу ФЗВ ф-кі „Дзьвіна"- За час падрыхтоўкі да пленуму ЦК Віцебская організацыя вырасла на 1915 чал.

У Гомелі акомсамолены ФЗВ „Рухавік рэволюцыі" і тарпяны ФЗВ. У Барысаве на ф-цы „Бярэзіна" з 1000 чал. моладзі у комсамоле—770

Возьмем адзін з вясковых раёнаў—Мсьціслаўскі. Гэты раён зьяўляецца найбольш характарным доказам таго, як можна узяць бальшавіцкія тэмпы. паказаць сапраўды бальшавіцкую працу па росту вясковай організацыі. Мсьціслаўскі р-н прыняў за 2-гі квартал у КСМ 598 чал. Організацыя за 2 месяцы вырасла з 337 чал. да 1115. Гэты раён далёка перагнаў такія організацыі, як Бабруйская, Аршанская, Жлобінская.

Мсьціслаўская організацыя паказала як трэба па-бальшавіцку працаваць і не пашкодзіла-б кой-каму павучыцца ў мсьціслаўскіх кіраўнікоў. як трэба браць бальшавіцкія тэмпы ў росьце.

Бабруйскі РК комсамолу—падарунак у 2-м квартале даў зьніжэньне ў росьце у параўнаньні з 1-м кварталам Бабруйскі РК КСМ, як рад іншых райкомаў, опортуністычна аднёсься да задач ператварэньня ленінскага комсамолу ў шматмільённую організацыю.

Ня гледзячы на некаторыя дасягненьні вышэйпералічаных організацый, усё-ж ацэньваць гэтую работу як здавальняючую мы ня можам,

Гэтае с л о в а „нездавальняючы" павінна быць унедрана ў мазгі кожнага ўдзельніка пленуму ЦК, кожнага сакратара райкому, кожнага комсамольца паасобку.

Біць па праваопортуністычнай стаўцы на самацёк

Пераходжу да характарыстыкі памылак і права-„лявацкіх" перагібаў у пытаньнях росту, якія зьяўляліся і зьяўляюцца вялікім тормазам, перашкаджаючым у нашай рабоце па ператварэньню КСМ у шматмільённую організацыю.

Трэба перш за ўсё застанавіцца на тым, у чым заключаецца іх сутнасьць Першае. Шмат камітэтаў не зразумелі політычнай сутнасьці рашэньняў IX зьезду аб шматмільённым комсамоле, працавалі, як вярблюды, як чарапахі. Бязумоўна, гэтае абвінавачаньне зьяўляецца цяжкім, але правільным. Гэта пацьвярджаецца тым, што ЛКСМБ да X зьезду прыняў 7636 чал., а пасьля зьезду ў 1-м квартале 9451 чал.— нязначнае павялічэньне. Мы павінны былі мець пасьля зьезду вялікае павялічэньне.

Другое: опортуністычная стаўка на самацёк. Многія камітэты не працавалі па росту, не разгарнулі масавай работы вакол росту комсамолу. Моладзь па-маленьку ішла ў КСМ, а кіраўніцтва сядзела і глядзела.

Дазвольце мне прадэманстраваць факты і паказаць вам герояў опортуністычнага самацёку, вярблюжых чарапашых тэмпаў.

Бабруйск прыняў у комсамол за 1 квартал 1931 г. 362 чал., за другі квартал 341 чал. Я ня ведаю, ці прыехаў сэкратар Бабруйкага раённага камітэту комсамолу т. Райхельсон на пленум ЦК. На нашым пленуме ЦК прысутнічае т. Вайнер. Няхай ён скажа, якім чынам Бабруйскі райкамол ухітрыўся зьнізіць тэмпы росту ў момант падрыхтоўкі да пленуму ЦК КСМ у той час, калі амаль-што ўсе організацыі ЛКСМБ даюць падвышэньне ў росьце за 2-гі квартал.

Далей, як ухітрыўся зьнізіць рост Петрыкаўскі РК ЛКСМБ, сэкратар яго тав. Ціханенка. За 1-ы квартал прынята 137 чал., за 2-гі квартал 132 ч.

У гэтым раёне маецца адна з буйнейшых фабрык, на якой налічваецца больш 500 чал. моладзі. а ў КСМ за 2-гі квартал прынята з гэтай ф-кі толькі 32 чал. На гэтай фабрыцы „Зьвязда" ахоп рабочай моладзі комсамолам складае 22,4 проц. Райком комсамолу не займаўся пытаньнем росту на гэтай фабрыцы. Рашэньне IX зьезду аб уцягненьні 100 проц. рабочай моладзі ў КСМ Петрыкаўскім РК ня было праведзена ў жыцьцё.

Возьмем Аршанскі РК ЛКСМБ. Аршанскі р-н прыняў у комсамол 362 чал. за 1-ы квартал і 341 чал. за 2-гі квартал. Наступны раён Смалявіцкі. Сэкратар Смалявіцкага РК т. Маркевіч. За 1-шы квартал прынята ў комсамол 74 ч. за 2-гі квартал рост комсамолу складае 72 ч. Вось бачыце, як ідзе рост, як людзі працуюць па-опортуністычнаму.

Характэрным зьяўляецца Хоцімскі р-н. Сакратар РК тав. Іофэ. Гэты р-н прыходзіць да суцэльнай колектывізацыі. І вось Хоцімскі РК КСМ ухітрыўся ў комсамол за другі квартал прыняць 44 чал.

Бялыніцкі раённы камітэт за другі квартал даў рост—37 чал. Старобінскі пагранічны раён прыняў у КСМ за 1-ы квартал 3 чал., за 2-гі квартал —82 чал. Тураўскі і Клімавіцкі раёны ў 1-м і 2-м кварталах у росьце мелі опортуністычныя тэмпы.

Трэба абвясьціць рашучую барацьбу опортуністычнай стаўцы на самацёк. Рад сакратароў нашых камітэтаў комсамолу даказалі сваю няздольнасьць весьці барацьбу за шматмільённы комсамол. Гэтыя сакратары ня выконваюць рашэньняў нашай партыі, саюзу. Гэтыя сакратары павінны быць самі пленумам ЦК зьняты з работы. Мы [illegible] якіх-бы то ні было [illegible], мы павінны зьнімаць з работы ўсіх тых, якія ня жадаюць выконваць рашэньняў IX зьезду УсеЛКСМ і пленуму ЦК УсеЛКСМ.

Да кожнага сакратара колектыву, да кожнай комсамольскай ячэйкі, мы павінны прадзявіць запатрабаваньне сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за шматмільённы комсамол.

Шмат камітэтаў не [illegible] політычнае барацьбы за прамфінплян, барацьбы за [illegible] рэконструкцыю сельскай гаспадаркі з пытаньнем росту комсамолу. Рост комсамолу адарвалі ад задач соцбудаўніцтва. Як прыклад, можна сказаць Хоцімскі р-н, які зьяўляецца раёнам суцэльнай колектывізацыі, а ў комсамол за тры месяцы прынята толькі 44 чал. Мы павінны [illegible] пытаньне ўдзелу комсамолу ў гаспадарчым [illegible] з ростам комсамолу, каб [illegible] соцбудаўніцтва.

Хто гэта робіць, той шкодзіць нашай агульнай справе.

Лінія „левакоў" у росьце КСМ

У чым сутнасьць памылак і права-„левацкіх" перагібаў у росьце комсамолу і па якіх лініях яны ішлі?

Першае: масавасьць, [illegible] у росьце комсамолу.

У нас, у комсамоле, ёсьць такія „вумнікі" і ёсьць такія [illegible] сакратары колектыву. [illegible] Ён разважае так: „Рашэньне IX-га зьезду і 2 пленуму ЦК УсеЛКСМ няправільнае [illegible] вацыць у комсамол лепшую карэнную частку рабочай моладзі". У такім-жа духу орыентуе, каб уцягваць карэнную рабочую моладзь у комсамол і Аршанскі РК КСМ. Аршанскі РК КСМ у сваёй пастанове-бюро райкому прапануе ўсім колектывам і ячэйкам раёну рашуча змагацца з тымі, хто недаацэньвае 100 проц. ахопу карэннай рабочай моладзі комсамолам.

Таварышы, ці маецца памылка ў гэтым пытаньні? Бязумоўна маецца Аршанскі РК орыентуе комсамольскую організацыю на барацьбу за ахоп комсамолам карэннай рабочай моладзі. Што азначае „карэнная"? Гэта значыць рабочыя, якія даўно працуюць на прадпрыемстве, гэта значыць па рашэньню Аршанскага бюро РК, ігнараваньне моладзі ўноўуліўшайся ў вытворчасьць. Ці даваў такую ўстаноўку наш IX зьезд ці пленум ЦК? Бязумоўна, не.

Гэтыя „ўмнікі" лічаць, што для іх няпрыемлім лёзунг „100 проц. рабочай моладзі ў комсамол". Што азначае лепшая карэнная рабочая моладзь у комсамоле? Гэтыя „архізахавацелі" ідэолёгічнай чыстаты нашага комсамолу тлумачаць так: што гэта за комсамолец, калі ён ня ўдарнік, калі ён нядаўна прышоў на вытворчасьць, калі ён політычна няпісьменны і не праявіў сябе на грамадзкай рабоце. Гэтыя людзі вітаюць нейдзе ў аблаках, забылі, што яны працуюць у комсамоле, што комсамольская організацыя як політычна-выхаваўчая організацыя прызвана і з неўдарніка рабіць ударніка і з неорганізаванага рабіць організаванага чалавека з політычна-няпісьменнага зрабіць політпісьменнага, з некультурнага зрабіць культурнага, з тэхнічна-неўзброеннага, зрабіць тэхнічна-ўзброеннага, зрабіць бальшавіка Пад гэтым лёзунгам хаваецца опортуністычная масабаязьнь. Але масабаязьнь росту праяўляецца ня толькі ў гэтым. Мы, напрыклад, вялікія майстры наконт агітацыі, а вось падыйсьці да беспартыйнага хлопца, пагутарыць з ім блізка аб яго жыцьці, аб рабоце ў цэху, аб зарплаце, дзе бывае, што ён лічыць патрэбным для палепшаньня культмасавай работы, пагутарыць індывідуальна з ім і аб яго ўступленьні ў комсамол—вось гэтага ў нас пакуль яшчэ мала.

Мы маем рад такіх фактаў, калі працуе сэкратар ячэйкі ў цэху і рабочая моладзь гэтага-ж цэху яго ня ведае. Прыкладна, на панчошнай фабрыцы беспартыйныя маладыя рабочыя якія працуюць у адным цэху з сэкратаром ячэйкі, на запытаньне хто, сэкратар комсамольскай ячэйкі, адказалі. што ня ведаюць. Бачыце, як справа пастаўлена.

У нас ёсьць яшчэ і такія „ўмнікі", якія гавораць аб тым, што комсамол павінен прымаць у свае рады толькі тую моладзь, якая ведае творы Маркса і Леніна (сьмех). Такія выпадкі былі з боку прадстаўнікоў асобных вясковых ячэек, з боку паасобных актывістых.

(З месца—там усе марксыстыя).

Адказ: напэўна той, хто таварыў зьяўляецца „вялікім" марксыстым.

(Голас: Гэта яшчэ пытаньне).

Адказ: Я гэта гавару з гіроніяй. Вы мяне павінны зразумець.

Таварышы, у нас ёсьць шмат прыкладаў, калі ў ФЗВ скажаюць рашэньне IX зьезду аб пагалоўным ахопе фабзавучнікаў комсамолам, прымаюць толькі фабзавучнікаў дзяцей рабочых, зусім ігноруюць прыём у КСМ колгасьнікаў, беднякоў і серадлякоў.

Таварышы, мы павінны памятаць, што кожны новы чалавек, які прыходзіць у наш комсамол, прыносіць з сабой новыя тэмпы. Вось прыкладна такі факт.

Таварыш Агароднікава, беспартыйная работніца Дубровенскай фабрыкі уступіла ў КСМ, заключыла ўмову на соцспаборніцтва. Раней, да ўступленьня ў КСМ ня выконвала прамфінпляну, зараз выконвае прамфінплян на 100 проц.

Наступны факт:

Хахлоў Ягор, ячэйка колгасу „1-га Мая" уступіў у комсамол у красавіку месяцы 1931 г., абвясьціў сябе ўдарнікам. У маі месяцы выпрацаваў 40 працадзён, а калі ня быў комсамольцам выпрацоўваў 20 працадзён.

Гэта сьведчыць аб тым, што ўноўуліваючаяся рабочая моладзь, фабзавучнікі перадавыя колгасьнікі адчуваюць адказнасьць што яны ўліваюцца ў політычную організацыю у рады ленінскага комсамолу, што яны зьяўляюцца барацьбітамі за бальшавіцкія тэмпы ў нашай рабоце.

Гэта не жадаюць зразумець некаторыя кіраўнікі нашай організацыі.

Характар праваопортуністычнага адхіленьня

Мы маем яшчэ такія тэндэнцыі, як прыём усіх колгасьнікаў у комсамол. Я зараз вам праілюструю рашэньне Тураўскага, Аршанскага раённых комітэтаў комсамолу, якія няправільна орыентуюць комсамольскія організацыі.

Тураўскі райком комсамолу ў сваёй пастанове піша: „трэба скарыстаць час прапрацоўкі рашэньня зьезду для узмацненьня росту комсамольскай організацыі за лік батрацкай, бядняцкай і перадавой колгаснай моладзі і лепшай часткі серадлякоў — аднаасобнікаў". Такім чынам бядняцкая частка моладзі пастаўлена на тое-ж месца. як і батрацкая моладзь.

У пастанове бюро Аршанскага раённага камітэту яшчэ лепш растлумачваецца пастанова IX зьезду: „У далейшым росьце комсамолу ў вёсцы ячэйкам неабходна шырока растлумачыць рашэньне IX зьезду УсеЛКСМ і тэзісы тав. Салтанава і прытрымлівацца у раёнах ня суцэльнай колектывізацыі прыёму у комсамол у першую чаргу батрацка-бядняцкай колгаснай моладзі і лепшую частку серадлякай моладзі".

[illegible] фармулёўкі. Так няправільна, політычна шкодна растлумачваецца рашэньне IX зьезду УсеЛКСМ. І так, згодна Аршанскага тлумачэньня, у комсамол прымаюцца [illegible] колгасьнікі і толькі. І толькі адносна серадлякоў трэба быць [illegible]. Няправільная шкодная орыентыроўка.

Мы маем яшчэ і і н ш ы я л а д к і, калі пры прыёме перадавых колгасьнікаў у комсамол, дзеляць іх на „бедняцкіх" і „серадлякоў". На першы погляд [illegible] справа, але, калі [illegible] якія не разумеюць тых соцыяльных зрухаў, якія адбыліся ў вёсцы, калі [illegible] і падразьдзяляў на беднякоў і серадняка ў мінулым годзе, гэта было правільна. Зараз прымаць перадавых колгасьнікаў у комсамол і дзяліць іх на соцыяльныя групы, г. зн. тварыць шкодную справу, гэта значыць, не разумець таго, што колгасьнікі зьяўляюцца апорай савецкай улады на вёсцы.

Падамо факты.

Сэкратар Слуцкага раённага камітэту т. Фуксон гаворыць, што самая лепшая характарыстыка ўступаючага ў комсамол колгасьніка гэта яго соцыяльны стан.

Бачыце, як сакратар райкому КСМ тлумачыць і орыентуе комсамольскую організацыю, як трэба прымаць перадавых колгасьнікаў у КСМ.

Падзел перадавых колгасьнікаў на беднякоў і серадлякоў прыводзіць да таго, што серадляка, які лепш працуе і паказвае ўдарныя тэмпы ў рабоце колгасу, затрымліваюць і ня пускаюць у комсамол Размовы аб тым, што мы асераднячым комсамольскую організацыю, гэта значыць пад „левай" фразай тварыць права-опортуністычную справу.

Наступнае пытаньне прыёму ў саюз аднаасобнікаў.

Справа абстаіць такім чынам. Ёсьць такія райкомы, якія прынялі за тры месяцы па 2 аднаасобнікі. Ёсьць і такія райкомы, якія ня прынялі ніводнага. Гэта гаворыць аб тым, што некаторыя організацыі КСМ узялі пад сумленьне правільнасьць рашэньня IX зьезду УсеЛКСМ аб прыёме ў КСМ беднякоў і серадлякоў аднаасобнікаў. Беларусь не зьяўляецца раёнам суцэльнай колектывізацыі. Трэба неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі, рашуча змагаючыся з усялякімі скажэньнямі лініі росту, з тымі, хто бярэ пад сумленьне правільнасьць рашэньня IX зьезду.

(Працяг будзе).

Выйсьці з тылу

Комсамольская організацыя Цераха[illegible] раёну, дзякуючы ўпартай работе сярод колгаснае моладзі, дабілася значных посьпехаў у росьце організацыі. Так, да пачатку вясеньняй сяўбы організацыя налічвала толькі 235 комсамольцаў. Зараз—416.

4 колектывы аднаюць 11 цэхавых колгасных ячэек з 158 комсамольцамі.

За час падрыхтоўкі да пленуму організавана 4 новых колгасных ячэйкі, ёсьць значны прыліў у старых. Так, ячэйка саўгасу Насовічы мела ў сваіх радох 4 чал., зараз—20. Ячэйка колгасу „Шлях Соцыялізму" 7 комсамольцаў, вырасла да 27.

У час падрыхтоўчай работы да ўборачнай кампаніі будуць організаваны яшчэ 6 колгасных комсамольскіх ячэек і 60 комсамольска-маладзёжных брыгад. замест 27, якія былі ў час вясеньня сяўбы.

Разам з ячэйкамі, якія сапраўды змагаюцца за шматмільённы комсамол, ячэйкі саўгасу „Пролетары", „Чырвоны ўдарнік", „Вольная Праца" за ўвесь час ня вырасьлі ні на аднаго чалавека.

Комсамолец

1.600.000.000 трэцяму, рашаючаму

Дэкаднік ударных тэмпаў рэалізацыі пазыкі пачаўся

КОМСАМОЛ ГОРАДУ, НА БУКСІР ВЯСКОВЫЯ ЯЧЭЙКІ

22-га ліпеня ў Народнага Камісара Фінансаў БССР тав. Хацкевіча адбылася нарада прадстаўнікоў цэнтральных установ і друку па пытаньню правядзеньня ударнага дэкадніка рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Побач з раёнамі, якія перавыканалі кантрольныя лічбы рэалізацыі пазыкі на вёсцы, ёсьць раёны, якія ганебна адсталі, што зьяўляецца вынікам дрэннае работы мясцовых організацый, якія ня здолелі мобілізаваць актыў працоўнага сялянства на хутчэйшую рэалізацыю пазыкі.

Ёсьць факты, калі ў некаторых раёнах, асабліва колгасах, надпіска на пазыку пачалася і праходзіць па ініцыятыве перадавых колгасьнікаў без непасрэднага штодзённага кіраўніцтва з боку партыйных, комсамольскіх, профсаюзных і савецкіх організацый.

40 проц. колектывізаваных гаспадарак—гэта вялікая армія перадавікоў, якія зьяўляцца перадавікамі рэалізацыі пазыкі.

Трэба рашуча біць па опортуністычных элемэнтах, якія зрываюць рэалізацыю пазык.

Пошта-тэлеграма

ЦСПСБ, Белколгасцэнтру, ЦК ЛКСМБ, цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзярж крэдыту і ашчадсправе пры ЦВК БССР

Нарада, якая адбылася 22-У11-1931г. пры Наркоме фінансаў прадстаўнікоў друку і цэнтральных установ па пытаньню рэалізацыі пазыкі „3-га, рашаючага году пяцігодкі“ ў выкананьне вашай пастановы аб ударным дэкадніку абвясьціла з 15-У11 г. г. пацідзёньнік дапамогі вясковым організацыям у справе рэалізацыі пазыкі на вёсцы і фактычнае праверкі на месцох выкананьня дадзеных па гэтаму пытаньню дырэктыў па ўсіх лініях.

У сьвязку з гэтым, зварачваючыся да вас гэтай пошта-тэлеграмай, прашу паслаць неабходную колькасьць для непасрэднай дапамогі месцам у правядзеньні дэкадніка праверкі выкананьня вашых дырэктыў і прыняць паогул па вашай лініі адпаведныя меры да актывізацыі падпарадкаваных вам мясцовых установ і організацый.

Адначасова з гэтым даручана тав. Захаравай увязаць пасылку людзей у раёны з такім разьлікам, каб найбольш моцныя работнікі выехалі ў самыя адсталыя раёны, а таксама каб не аказалася, што ў адным раёне будзе густа, а ў другім пуста.

Нарком фінансаў БССР Хацкевіч.

ЭЛЕКТРОЗАВОДЦЫ ВЫКЛІКАЮЦЬ

Брыгада электрозаводцаў ў рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“

Учора брыгада МаскоўскагаЭлектрозаводу, які шэфствуе над Наркомфінам, наведала рэдакцыю „Чырвонай зьмены“.

Брыгада прыехала для дапамогі ў хутчэйшай рэалізацыі пазыкі „трэцяга, рашаючага“ на вёсцы. У рэдакцыі брыгада азнаёмілася з станам удзелу ленінскага комсамолу Беларусі ў рэалізацыі пазыкі „3-га рашаючага“.

У сваім лісьце ў рэдакцыю брыгада электрозаводу піша:

„Пролетары Маскоўскага Электрозаводу, выканаўшы пяцігодку ў два з паловай гады, высунулі прапанову аб выпуску пазыкі трэцяга рашаючага.

Рабочыя электрозаводу шэфствуюць над Наркомфінам. Конкрэтнымі справамі мы ажыцьцяўляем рабочае шэфства.

Зараз мы скарыстоўваем свой чарговы водпуск для таго, каб дапамагчы адстаючым вясковым раёнам у рэалізацыі пазыкі.

Сёньня мы выяжджаем у раёны для конкрэтнай работы.

Брыгада спадзяецца, што кожная комсамольская ячэйка, кожны райком комсамолу будзе конкрэтным дапаможнікам нашай штодзённай працы.

Мы заклікаем комсамольцаў Беларусі скарыстаць свае выходныя дні для конкрэтнай дапамогі ў рэалізацыі пазыкі. Вярэце прыклад конкрэтнага рабочага шэфства.

Сумеснай энэргічнай працай мы здолеем з гонарам выканаць ускладзеную на нас задачу.

Брыгада электрозаводцаў

Стратановіч, Баумольц, Шэрман.

ЛЕС ПАВІНЕН ПЛЫСЬЦІ ШПАРЧЭЙ ПЛЫНІ ВАДЫ

Праца сплаўных організацый не забясьпечвае сплаву тэмпаў соцбудаўніцтва

Програма сплаву складаецца з 3.573.659 к.м. будаўнічай драўніны і 709.068 кубамэтраў дроў. На 10-VII г. г. падвезена да сплаўных пунктаў будаўнічай драўніны 2.046.596 к. м., дроў 363.906. Усяго падвезена 56,3 проц. вызначаных на пляну падвозкі на 10-УІІ. З гэтай драўніны пушчана ў сплаў у адносінах да пляну 47,4 проц., а ў адносінах да падвезенай драўніны—84,2 проц.

Гэтыя лічбы вельмі яскрава характарызуюць ход сплаву на Беларусі. Плян папярэдняй падвозкі драўніны да пункту сплаву ня выкананы, аб чым з усёй яскравасьцю сьведчыць і зьмяшчаемы сёньня матар'яла, падвезеная драўніна ня цалкам сплаўлена.

Неабходна самым рашучым чынам разьбіць опортуністычную стаўку на самацёк цэлага раду савецкіх, партыйных і комсамольскіх організацый у справе выкананьня пляну падвозкі драўніны.

Прарывы на сплаве ня маюць ніякага апраўданьня. Як відаць з лічбаў, довад, які спрабавалі высунуць працаўнікі сплаву, як прычыну недавыкананьня сплаўнога пляну—недавывазка лесу, не мае ніякай падставы. Яшчэ нават ня пушчана ў сплаў уся падвезеная драуніна.

Па сплаўканторах ход сплаву наступны:

Заходня-Дзьвінская сплаўкантора (Віцебск)—падвезена да прыстаняй 56,8 проц. пляну. Пушчана ў сплаў у адносіне да пляну 56 проц, да колькасьці падвезенай драўніны 98,4 проц.

Бярэзінска-Дняпроўская кантора (Бабруйск)—падвезена 54,6 проц., пушчана ў сплаў 43,8 проц. пляну. У адносінах да падвезенай драўніны толькі 80,3 проц.

Сож-Дняпроўская (Гомель)—падвезена 55,1 проц. пляну. Пушчана ў сплаў 52,4 проц. у адносінах да агульнага пляну і 95 з усяе колькасьці падвезенай драўніны.

На Прыпяцкай карторы (Мазыр)—падвезена 60,7 проц., пушчана ў сплаў 43,7 проц., у адносінах да агульнага пляру і 72 проц. да ўсяе колькасьці падвезенай драўніны.

У гэтых лічбах мы зноў-жа маем пацьверджаньні таго, што нават пры існуючым становішчы з падвозкай, непасрэдную операцыю сплаву можна весьці большымі тэмпамі. Асабліва на Прыпяцкай і Бярэзіна-Дняпроўскай канторах.

Дагэтуль яшчэ не наладжана як сьлед організацыя працы, не скарыстоўваюцца ўсе мажлівасьці выкананьня пляну.

Час не чакае. Скарыстаць кожны дзень каб выканаць плян.

У матар'ялы прокурора

Украдзена 28 дзён на рашаючым вучастку

Вінаватыя павінны адказаць

Мы ніжэй падпісаўшыяся, упаўнаважаныя арцелі сплаўшчыкаў, вёскі Чучы Скрыганаў, упаўнаважаны арцелі вёскі Гаранкі-Казачонак, дзесятнік Сьвіслацкага сплаўнага вучастку Жагалкоўскі склалі гэты акт у тым, што на прыстані Чуча працуюць дзьве арцелі у ліку 28 асоб і ўвесь час ёсьць прастоі з-за адсутнасьці сплаўнога рэквізіту.

Ня гледзячы на неаднаразовыя заявы дзесятнікаў і офіцыйныя просьбы Сьвіслацкага сплаўвучастку аб недахопе сплаўных прыпасаў Ранетоўскаму вучлесгасу, апошні ніякіх захадаў ня прымае.

У выніку гэтага дзесятага ліпеня ўсе сплаўшчыкі мелі прастой і сплаўкантора прымушана была падвозіць рэквізіт па павышаных цэнах, каб забясьпечыць працу сплаўшчыкаў, ня гледзячы на тое, што вучлесгас мае свой транспорт.

Подпісы.

За дэкаднік даць перамогу лесу

Студэнты Менскага Хэміка-Тэхнолёгічнага тэхнікуму, абвясьціўшы сябе мобілізаванымі на ліквідацыю прарыву па выкананьню пляну лесанарыхтовак, 18-га ліпеня у ліку 80 асоб выехалі на 10 дзён ў Асіпавіцкі раён для працы. Студэнты узялі на сябе абавязак у час 10-дзённай працы разгарнуць культурна-масавую работу сярод насельніцтва, дапамагчы бліжэйшаму колгасу у організацыі працы, наладжваньні ўліку.

Юнкоры і селькоры тэхнікуму працуюць над выпускам насьценгазэты.

Студэнты Хэміка-Тэхнолёгічнага Комбінату скарацілі на 10 дзён тэрмін назучаньня і выклікаюць студэнтаў іншых навучальных установ пасьледваць іх прыкладу.

У ліку выехаўшых студэнтаў выехала „чырвоназьменаўская“ брыгада.

Сябр „Чырвоназьменаўскай брыгады

Я. Канончык.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ЧАКАЕ АД ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛУ:

клясава-сьвядомага, пісьменнага і дысцыплінаванага папаўненьня

Комсамолія, праверым, як рыхтуем ударнае папаўненьне. Дапаможам мясцовым організацыям выканаць задачу, пастаўленую Рэўваенсаветам!

„ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“ праводзіць 1-га жніўня ўсебеларускі рэйд ударнікаў-„чырвоназьменаўцаў“.

Камітэтам ЛКСМБ неабходна зараз-жа разгарнуць падрыхтоўку да рэйду, неабходна правесьці гутаркі і нарады юнкораў і ўдарнікаў на тэмы:

— Прызыў 3-га рашаючага году і задачы комсамолу і юнкораў.

— Як правесьці рэйд.

Да падрыхтоўчай і ўсяе работы па рэйду неабходна прыцягнуць райваенкаматы і сумесна з імі забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне рэйду.

Памятка ўдзельніка рэйду будзе зьмешчана ў заўтрашнім нумары нашай газэты.

Загад РВС СССР № 118

17 ліпеня 1931 *г., г. Масква*

І. Прызваць на сапраўдную вайсковую службу ў рабоча-сялянскую Чырвоную армію ў пэрыод з першага верасьня па 1-е лістапада г. г, грамадзян нараджэньня 1909 г. і старэйшых ўзростаў, якім скончылася адтэрміноўкі прызыву.

Дакладныя тэрміны прызыву вызначыць рэволюцыйным вайсковым саветам акруг.

II. Прызываемых, раней праслужыўшых у страявых частках РСЧА ня менш аднаго году, ці ў адміністрацыйных установах РСЧА ня менш двух год, лічыць адбыўшымі тэрмін службы і пералічыць у запас першай чаргі.

Падстава: Ст. 131 закону аб абавязковай вайсковай службе.

Намесьнік народнага камісара па ваенных і морскіх справах і старшыні РВС СССР Гамарнік.

Прыступіць да конкрэтнай работы

У саўгасе імя Будзёнага (Менск, прыгарадны раён) працуе 140 студэнтаў Менскага Ветпэдтэхнікуму. Студэнты на сваім агульным сходзе прынялі рэзолюцыю аб ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў 1909 га году ня толькі ў саўгасе, але ў акаляючых колгасах і вёсках.

Комсамольская ячэйка ўзяла на сябе гэтую адказнасьць, але яшчэ да сёньняшняга дня нават ня прыцягвала комсамольцаў да прызыўнікоў.

Сэкратар цэх. ячэйкі тав. Віньнікава не правярае, як выконваецца гэтая пастанова, вынесеная сходам.

Комсамольскай ячэйцы неабходна на хаду зьнішчыць дапушчаныя памылкі і зараз-жа прыступіць да конкрэтнай працы па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў.

Б. С.

Дамо Чырвонай клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне

„Чырвоназьменаўцы“, *першага жніўня праводзім усебеларускі рабселькораўскі рэйд ударнікаў-юнкораў „Чырвонай Зьмены“ сумесна з комсамолам Беларусі па праверцы стану падрыхтоўкі да прызыву 1909 году нараджэньня.*

Рыхтуйцеся да рэйду!

Юнкорыя! Сумесна з комсамоліяй вашага раёну правядзеце па-баявому гэты рэйд.

„Чырвоная Зьмена“.

Усім ГК і РК ЛКСМБ

У сувязі з тым, што 1-га жніўня „Чырвоная Зьмена“ праводзіць усебеларускі рэйд юнкораў па праверцы ходу ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікаў 1909 году нараджэньня, ЦК ЛКСМБ прапануе ўсім камітэтам уключыцца ў гэты рэйд, забясьпечыўшы пасьпяховае яго правядзеньне.

Вынікі рэйду даслаць у „Чырвоную Зьмену“ і ЦК ЛКСМБ не пазьней 4-га жніўня.

Загадчык аддзелу адукацыі і быту ЦК ЛКСМБ Рубінчык

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599